

# Урок 95

Разгледзь, як выканалі дзяленне з астачай.

46 : 10 = ?

1. Каб падзяліць 46 на 10, даведаюся, колькі разоў па 10 змяшчаецца ў ліку 46, або колькі дзясяткаў у ліку 46.



2. У ліку 46 усяго 4 дзясяткі. Атрымліваю дзель 4. У астачы — 6 адзінак.

46 : 10 = 4 (аст. 6)

**1.** Выканай і правер дзяленне з астачай.

| | | |
|---|---|---|
| 67 : 10 | 452 : 10 | 65 243 : 10 |
| 51 : 10 | 897 : 10 | 552 534 : 10 |

**2.** Выканай і правер дзяленне з астачай.

| | | |
|---|---|---|
| 253 : 100 | 36 135 : 100 | 54 827 : 1000 |
| 812 : 100 | 67 634 : 100 | 36 714 : 1000 |
| 5624 : 100 | 128 540 : 100 | 70 077 : 1000 |

**3.** Знайдзі лік, калі:

- пры дзяленні яго на 10 у дзелі атрымліваецца 151, а ў астачы — 7;
- пры дзяленні яго на 100 у дзелі атрымліваецца 37, а ў астачы — 40.

**4.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 402 дм ? 40 м | 8 м 23 см ? 823 дм |
| 425 мін ? 4 г 25 мін | 2 г 12 мін ? 212 мін |
| 3450 кг ? 3 ц 45 кг | 3 ц 3 кг ? 333 кг |
| 606 $см^2$ ? 6 $м^2$ 6 $см^2$ | 1 га 1 а ? 10 001 $м^2$ |

**5.** Складзі пытанне. Рашы задачу.
У пяці аднолькавых скрынях было на 30 кг больш персікаў, чым у трох такіх скрынях.



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** У адным кілаграме глебы аказалася $\frac{1}{4}$ кг пяску, $\frac{1}{5}$ кг перагною, а астатняе — гліна. Колькі грамаў гліны змяшчаецца ў адным кілаграме гэтай глебы?

**7.** У 9 г раніцы з двух гарадоў насустрач адзін аднаму выйшлі два цягнікі. У 11 г раніцы да сустрэчы ім заставалася прайсці 420 км. Знайдзі скорасць аднаго цягніка, калі скорасць другога была 100 км/г, а адлегласць паміж гарадамі — 780 км.

**8.** Начарці прамавугольнік *DCKL*, перыметр якога роўны 200 мм, а даўжыня большая за шырыню на 20 мм. Правядзі адрэзак так, каб падзяліць гэты прамавугольнік на дзве роўныя па плошчы часткі.

**9.** Знайдзіце з дапамогай інтэрнэту, якія прыблізныя даўжыні рэк Дняпра і Дзвіны. Даведайцеся, па тэрыторыі якіх краін працякаюць гэтыя рэкі. Складзіце розныя задачы, дзе трэба параўнаць працягласці ўчасткаў гэтых рэк у розных краінах.

? Колькі ўсяго дзясяткаў у ліку 532 835? Усяго соцень? Усяго тысяч?

**1.** Выканай і правер дзяленне з астачай.
444 : 10 1238 : 10 467 : 100 5897 : 100

**2.** Турысты купілі палатку, рукзакі і спальныя мяшкі. Палова кошту пакупкі была зрасходавана на палатку. На астатнюю частку грошай купілі 2 рукзакі па цане 144 р. і 2 спальныя мяшкі па цане 65 р. Які кошт усёй пакупкі?



Правообладатель Национальный институт образования